УДК 801.311.11(476)

# НАЗВЫ НАСЕЛЕНЫХ ПУНКТАЎ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ

***Студ. Дыдо В.А., студ. Дзмітрыева А.І., ас. Абазоўская Н.В.***

*УА «Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт»*

З геаграфічнымі назвамі сустракаемся мы ў жыцці на кожным кроку: пішам іх на канвертах, чуем па радыё, чытаем у кнігах і газетах, называем у гутарках са знаёмымі і таварышамі.

Большасць геаграфічных назваў склалася паступова, іх ніхто спецыяльна не прыдумляў. Яны ўтварыліся ад звычайных слоў, якія мы чуем. Напрыклад, веска Зарэчча атрымала такую назву таму, што знаходзіцца за ракой; веска Дубравы — таму, што стаіць ці стаяла каля дубовага лесу; Навасёлкі — таму, што з'явіліся нядаўна (новае паселішча); Старое Сяло названа так таму, што яно старэй за суседнія і г. д.

Можна заўважыць, што кожная геаграфічная назва мае, па сутнасці, два значэнні. Па-першае, яна з'яўляецца імем таго ці іншага геаграфічнага аб'екта, а па-другое, кожная назва ў нейкай ступені характарызуе гэты аб'ект. Асаблівасцю геаграфічных назваў з'яўляецца іх устойлівасць. Назвы захоўваюцца і ў тым выпадку, калі з'явы, якія ў іх адлюстроўваюцца, ужо зніклі. Веска Залессе захавае свае імя і пасля таго, як лес, за якім яна знаходзіцца, будзе высечаны. Веска Забалоцце будзе так называцца і пасля таго, як балота будзе асушана. Таму назвы цікавы і для гісторыі. Яны сведчаць іншы раз аб даўно знікшых з'явах, даўніх падзеях.

Напрыклад, у мінулым тысячагоддзі нашы продкі выплаўлялі жалеза з беднай балотнай руды ў спецыяльных печах-рудніцах. Вакол рудніц пасяляліся людзі — зборшчыкі руды, рудакопы, кавалі, іх сем'і. Так узнікалі паселішчы, якія атрымлівалі назвы Рудня, Руда, Рудзенск. Зараз у Беларусі ёсць некалькі дзесяткаў сёл з падобнымі назвамі. Такія геаграфічныя імёны дапамагаюць гісторыкам і археолагам знайсці месца старадаўніх жалезаробчых промыслаў.

Шырока выкарыстоўваліся раней у гаспадарцы рэкі, нават дробныя. Па іх перавозілі ў лодках грузы. Гэта было дзешавей і зручней, чым на конях. Але з адной рэчкі ў другую грузы даводзілася цягнуць волакам па сушы. На гэтых месцах узнікалі паселішчы, якія іншы раз атрымлівалі і адпаведную назву: Волак, Валачок, Вышні Валачок, Валакаламск і інш. Там, дзе праз рэчку праходзіла дарога, будавалі масты, але часцей рабілі спецыяльныя паромныя пераправы для перавозу людзей і грузаў; у такіх месцах узнікалі паселішчы, за якімі замацоўваліся назвы Перавоз, Верхні Перавоз і г. д. Калі рака была невялікая, абыходзіліся і без пераправаў. У такіх выпадках знаходзілі на рацэ мелкае месца з цвёрдым грунтам і раку пераязджалі ўброд, а паселішча каля такога броду называлі Брады, Заброддзе, Брадок і г. д. На падрабязнай карце Беларусі мы часта сустракаем такія назвы, як Волакі, Перавоз, Маеты, Брады, Старыя Дарогі і інш. Яны сведчаць аб старажытных шляхах зносін. Часам мы ўжо не здольны высветліць, што абазначалі раней тыя ці іншыя геаграфічныя назвы, адкуль яны паходзяць, бо словы, ад якіх яны ўтварыліся, даўно забыты. Але ясна тое, што кожная назва калісьці была зразумела людзям. Мы назіраем і зараз, як паступова знікаюць адны словы і з'яўляюцца новыя.

У Беларусі ёсць вёскі Асецішча, Матыкі, Прызбы, Кнотаўшчына, Кросніца і інш. Словы, ад якіх паходзяць такія назвы, памятаюць толькі старыя. Асеццю звалі некалі невялікую павець ці збудаванне для складання снапоў, іншы раз і захавання зерня; у наш час гэта слова ўжываецца рэдка. Матыка — гэта ручны інструмент для абгонкі бульбы (абкучвання), а таксама для праполкі глебы. Прызба — гэта земляны насып вакол драўлянай хаты. У новых вёсках прызбы сустракаюцца ўжо рэдка. Кнот — слова яшчэ шырока вядомае (кнот у лямпе, свечцы), але і яно паступова знікае разам з развіццём электрыфікацыі. Кроены — гэта станок для хатняга ткацтва.

Пройдуць яшчэ дзесяткі гадоў, і такія словы будуць канчаткова забыты, а ўтвораныя ад іх назвы будуць здавацца таямнічымі.

Витебский государственный технологический университет

Геаграфічныя назвы часта захоўваюць памяць аб падзеях, не запісаных у гістарычных летапісах. Адгадка іх таямніц можа даць новыя, вельмі цікавыя факты для гісторыка і географа. Але даследчыку геаграфічных назваў неабходны глыбокія веды ў розных галінах навукі, гісторыі, геаграфіі, мовазнаўстве, этнаграфіі, археалогіі, народнай гаспадарцы і г. д. Без гэтых ведаў мы можам часта памыліцца і не атрымаць патрэбных вынікаў нашых даследаванняў.

Высветліць паходжанне геаграфічных назваў цяжка яшчэ і таму, што самі яны змяняюцца, хоць гэта адбываецца паступова і павольна. Адны назвы захоўваюцца ў тым жа выглядзе з самых даўніх часоў, другія — некалькі змяняюцца, трэція — зусім аджываюць. Так, напрыклад, сучасны Брэст быў вядомы ў X—XII стст. як Берасце, сучасны горад Гродна меў імя Гарадзень, Слонім — Услонім, Мінск — Менеск і г. д. Змены ў назвах адбываюцца па розных прычынах: адны — над уплывам частага і доўгага ўжывання, другія — пад уплывам змен пры вымаўленні, трэція — у выніку прыстасавання іншамоўнага слова да прывычнай роднай мовы і г. д.

З вышэйсказанага відаць, як цяжка іншы раз высветліць сапраўднае паходжанне геаграфічнай назвы. Не заўсёды гэта могуць зрабіць нават спецыялісты. Але народ ужо даўно цікавіўся назвамі. Не маючы магчымасці высветліць сапраўдную іх гісторыю, людзі часта складалі байкі аб паходжанні назваў асобных рэк і гор, вёсак і гарадоў. Многія з іх не маюць пад сабой ніякай сапраўднай асновы. Даводзілася, напрыклад, чуць, што назва вёскі Латыгаль на Беларусі паходзіць быццам бы ад слоў *латы* і *голь,* гэта значыць — людзі ў залатаным адзенні. Вядома, у старой царскай Расіі было многа назваў, якія сведчылі аб жабрацтве і бескультур'і старой вёскі, але назва Латыгаль зусім іншага паходжання. Латыгаллю звалі раней жыхароў усходняй Латвіі, людзей, якія паходзілі з тых мясцін. Паселішчы з такімі назвамі былі асвоены людзьмі з Латыгаліі.

У Беларусі ёсць некалькі вёсак, якія маюць назву Хімы, Кімія ці Хімец. Можна пачуць ад мясцовых жыхароў тлумачэнне, быццам такія назвы паходзяць ад назвы навукі хіміі. Але пры такім тлумачэнні невядома, якія адносіны мае хімія да назвы вёскі. Акрамя таго, хімія як навука з'явілася незначна пазней і не была вядома вясковым жыхарам, якія давалі такія назвы і іх ужывалі. Сапраўды ж назвы паходзяць ад балтыйскай назвы расліны кімінай (хвошч балотны).

Назва Дзвіна (Заходняя) вядома ўсім. Некаторыя звязвалі яе з латышскім *дві (дзве),* маючы на ўвазе тое, што рака нібыта пачынаецца двума вытокамі. Але вядома, што ў Латвіі рака называецца не Дзвіной, а Даўгавай. Вытокі ракі наўрад ці былі вядомы тым, хто ўжываў гэту назву. Пачынаецца яна адным вытокам і г. д.

Падобныя легенды існуюць не толькі ў вуснай народнай творчасці, але іншы раз з'яўляюцца і ў друку, таму не заўсёды можна адрозніць праўду ад вымыслу.

Але нельга сцвярджаць, што ўсе народныя тлумачэнні заўсёды недарэчныя і памылковыя. Вельмі часта яны дапамагаюць адкрыць сапраўдную таямніцу назвы, яе першапачатковы сэнс. Вядома, што не ўсе вялікія і малыя падзеі запісаны ў гістарычных дакументах. Асобныя назвы звязаны іншы раз з прыватнымі з'явамі, не запісанымі ў летапісах і вядомымі толькі мяцовым жыхарам. Такія назвы бываюць вельмі цікавымі.

Прыведзеныя прыклады гавораць аб тым, што збіраць мясцовыя геаграфічныя назвы няцяжка, а знайсці правільнае тлумачэнне і прасачыць іх паходжанне і змены значна цяжэй. Пры тлумачэнні геаграфічных назваў не варта рабіць заўчасныя вывады. Трэба грунтоўна і ўсебакова высветліць абставіны, пры якіх магла з'явіцца назва, добра ўявіць сабе тыя часы, у якія яна магла ўзнікнуць, ведаць мову, асаблівасці жыцця і гаспадаркі таго часу і г. д. Памылкі пры тлумачэнні геаграфічных назваў здараюцца таму, што старадаўнюю назву людзі імкнуцца пазнаць з пункту гледжання сучаснай мовы і сучаснага спосабу жыцця. Таму тлумачэнне геаграфічных назваў павінна быць сумеснай справай не толькі географа, але і гісторыка, і мовазнаўца. Да тлумачэння назваў трэба падыходзіць перш за ўсё з пазіцый не сучаснай мовы, а яе гісторыі.

На першы погляд здаецца, што назвы выпадковыя і між імі няма нічога агульнага. Але пры ўважлівым разглядзе іх можна заўважыць, што адны назвы звязаны з прыроднымі

Витебский государственный технологический университет

ўмовамі, другія — з заняткамі жыхароў, трэція — характарызуюць само паселішча. Многія назвы паходзяць ад прозвішчаў і імёнаў людзей, некаторыя дадзены ў гонар выдатных людзей ці гістарычных падзей.

Першая, самая шматлікая група геаграфічных назваў, звязана з прыроднымі ўмовамі. Асабліва многа такіх назваў сярод невялікіх сельскіх паселішчаў. Яны адлюстроўваюць асаблівасці глебаў, расліннасці, жывёльнага свету, паверхні зямлі. У назвах беларускіх вёсак можна пазнаць амаль усе назвы нашых дрэў і многіх траў. Гэта такія назвы, як Бор, Барок, Уборак, Прыбар, Дубровы, Дубкі, Бярозаўка, Бярозкі, Бярэзіна, Арэхаўка, Альшанка, Сосны, Вязок, Іўе, Івянец, Вербы, Кляновае, Ельня, Крушынаўка, Ясень, Ясянец, Верасоч, Крапіўнае, Асочнае, Чамярычнае, Ячэнішкі, Рэпішча, Махавое, Камышанка, Ліпаўка, Ліпск і г. д.

У назвах некаторых вёсак (Мядзведжае, Барсуковае, Ласінавостраўскае, Аленні сцежкі і інш.) замацаваны назвы жывёл. Вядома, усе гэтыя назвы з'явіліся даўно, і многія з іх адлюстроўваюць толькі мінулае. На рацэ Воўчай няма ваўкоў, зніклі многія дубровы, але вёскі захавалі свае назвы. Аб асаблівасцях паверхні і глебы сведчаць такія назвы паселішчаў, як Падгорнае (пад гарой), Сухі Лог, Пясочнае, Глінішча, Роўнае поле, Горушка.

Другая група назваў таксама шматлікая. Да яе належаць геаграфічныя імёны, якія адлюстроўваюць дзейнасць людзей. У імёнах беларускіх вёсак мы часта сустракаем назвы промыслаў і прадпрыемстваў. Прыкладамі могуць быць такія назвы, як Рыбаловы, Мельнікі, Ткачы, Сталяры, Слесары, Токары, Лесазавод, Млынок, Ферма, Цагельня і г. д. Большасць такіх імёнаў адлюстроўвае мінулае. Даўно ўжо прайшлі часы дамашняга ткацтва і саматужнага цяслярства, але раней такія промыслы былі вельмі распаўсюджаны. Назвы многіх паселішчаў падкрэслівалі беднасць і нізкі культурны ўзровень жыхароў у мінулым. На Палессі былі ў нас сёлы Малаеды, Бясхлебічы, Гразіеўка, Бяднішкі і інш. Трэцюю групу складаюць назвы гарадоў і вёсак, якія характарызуюць само паселішча. Напрыклад: Навагрудак, Навасёлкі, Старое Сяло, Вялікае Сяло, Крывое Сяло, Круглае, Доўгае, Хутар, Засценак, Пагост, Выселкі і інш. Тут мы сустракаемся іншы раз і са словамі, якія ўжо зніклі ці знікаюць з нашай мовы. Напрыклад, засценкам называлі некалі невялікае паселішча ў 3—4 двары, якое заснавалі перасяленцы з суседняга вялікага паселішча. Прыблізна ж такое значэнне мела і слова *выселак*. Пагост — вельмі даўняе слова. Многа стагоддзяў назад пагостам называлі невялікае паселішча, у якім спыняўся па дарозе князь для збору даніны і абмену тавару. Затым пагостам сталі называць царкоўны двор і могілкі. Слова *хутар* яшчэ сустракаецца ў нашай мове, але паступова забываецца. Хутар — гэта асобны дом, гаспадарка воддаль ад вёскі.

Чацвёртую групу складаюць назвы, утвораныя ад прозвішчаў ці імёнаў пасяленцаў. Гэта, напрыклад, вёскі Якімовічы, Аляхновічы, Васілевічы, Пятроўшчына, Іванаўшчына, Домжарыцы, Іванава, Барысаў і г. д. У назвах вёсак і гарадоў замацаваны іншы раз і старыя імёны людзей, якія ў наш час ужо не ўжываюцца. Прыкладамі такіх старажытных імёнаў могуць быць Траццяк (трэці сын), Ждан (жданы, чаканы сын), Няждан (няжданы, нечаканы сын), Дамарад (радасны ў доме).

Некаторыя назвы гавораць аб нацыянальным складзе пасяленцаў. На Беларусі мы сустракаем вёскі Татарка, Татаршчына, Татарынавічы, Літва, Літоўшчына, Літвінавічы, Латыгаль, Латыголічы, Ятвезь, Обрава, Дулебы, Мазуры, Кашубы.

Пятую групу складаюць назвы, у якіх замацаваны рэлігійныя святы, імёны святых, назвы цэркваў. У нашай краіне такіх назваў засталося ўжо мала, але ўсё ж дзе-нідзе сустракаюцца. Асабліва многа іх у краінах, дзе быў моцны ўплыў каталіцкай царквы: у Францыі, краінах Пірэнейскага паўвострава і Лацінскай Амерыкі. Там з'яўляліся такія назвы, як Сан-Францыска (святы Францішак), Санта-Фэ (святая Вера), Лос-Анджэлес (горад анёлаў) і г. д.

Такім чынам, мы можам зрабіць вывад, высветліць, чаму так або інш называецца той або іншы геаграфічны аб'ект, бывае вельмі цяжка. Але дзякуючы намаганням навукоўцаў

Витебский государственный технологический университет

у нас застаецца ўсё менш таямніц у паходжанні геаграфічных назваў паселішчаў нашай бацькаўшчыны.

УДК 159.923–057.875

# ПСИХОЛОГИЧЕСКИЕ АСПЕКТЫ ИМИДЖА СОВРЕМЕННОГО СПЕЦИАЛИСТА

***Ст. преп. Милашевич Е. П.***

*УО «Витеский государственный университет им. П.М. Машерова»*

*Удачный имидж – это долгосрочный вклад в профессиональный и личный успех*

Проблема имиджа – это проблема перемен, новых подходов к видению самого себя, и, следовательно, новых идей. Необходимость осуществления изменений своего имиджа сегодня обусловлена целым рядом факторов: преобразованиями, происходящими в общественной жизни нашей страны, успешным европейским опытом формирования имиджа делового человека, изменениями в стиле жизни значительной части общества, усиливающейся потребностью человека добиться успеха и иметь этот успех, ситуацией на рынке труда и конкурсной системе подбора персонала, развитием новых направлений и специализаций, связанных с имиджем: имиджмейкер, стилист, визажист, спичрайтер и другие. Известно, что в 60-е годы американский экономист Болдуинг ввёл в оборот понятие «имидж» и обосновал его необходимость в деловом преуспевании. Впоследствии имидж был взят на вооружение зарождающейся политологией, специалисты которой сделали имиджирование важной составляющей своей работы. В настоящее время имидж стал ходовым товаром у всех, кто занимается предпринимательской, политической, преподавательской или любой другой публичной деятельностью.

Понятие "имидж" (от лат. imago – образ, от англ. image – образ) получило широкое использование и приложение в самых разных областях знания: социологии, психологии, политологии, антропологии, культурологии. По объему и содержанию оно стало междисциплинарным, формировалось в категориальном поле многих наук и интерпретировалось в соответствии с их особенностями, целями и задачами. При этом в сознании современного человека все более закрепляется представление об имидже как об определенной ценности. Имидж определяет место человека в структуре общественных, профессиональных и межличностных отношений. По мнению А.П. Панфиловой, имидж есть личное послание миру, зашифрованное на языке символов. Имидж – это публичное «Я» человека. Профессиональный имидж – это представление о человеке как о специалисте или профессионале [1]. Некоторые специалисты считают, что имидж – это искусство очаровывать, которое обусловлено: внешней привлекательностью человека; склонностью к общению и лидерству; лёгкой адаптацией к новым условиям; умением сохранить уверенность в кругу незнакомых людей; терпимостью к инакомыслию; психологической андрогинией. В основе формирования собственного имиджа лежит, прежде всего, работа над собой, над своей внешностью, которая зависит не только от внешних атрибутов, но и от состояния здоровья и работоспособности человека, его настроения и душевного комфорта, от умения управлять собой в стрессовых ситуациях и в условиях профессиональной деятельности.

Имидж как конкретная психологическая продукция, является ценностным стереотипом, установкой и выполняет определённые функции.

*Ценностные функции имиджа:*

Личностно-возвышающая – благодаря положительному имиджу создаётся облик личности, который подчёркивает её достоинство, визуально опредмечивает её лучшие характеристики и в целом демонстрирует её индивидуальную незаурядность.

Психотерапевтическая – личность, обладающая обаянием, обречена на людское внимание и признание, что пополняет и даже восстанавливает её биоэнергетику. Это та



Витебский государственный технологический университет